*В. А. Коласава*
(Вілейка)

# Вілейскі краязнаўчы музей – 30 гадоў з дня заснавання

Усім сэрцам люблю зямлю, што мне жыццё дала,
што на старасці хлебам корміць, што не адмовіць
мне ў месцы на апошні адпачынак.

*Канстанцін Тышкевіч*

Кожны край мае сваю гісторыю, самабытную, непаўторную культуру і прыродную спадчыну. Вывучэнне гістарычнага мінулага дазваляе ўбачыць малюнкі жыцця нашых продкаў, паказаць вытокі сучаснасці. Кожны чалавек павінен ведаць гісторыю родных мясцін, культурныя традыцыі свайго краю, знакамітых землякоў. А ведаць – значыць цаніць і берагчы, ганарыцца і будзіць нацыянальны гонар, пачуццё патрыятызму, без якога няма асобы. Да дасягнення гэтай мэты і накіравана дзейнасць Вілейскага краязнаўчага музея, які ў гэтым годзе адзначыў 30 гадоў з дня заснавання.

Задума арганізаваць у Вілейцы краязнаўчы музей зарадзілася ў 1939 г., калі горад быў цэнтрам Вілейскай вобласці. Аб гэтым пісаў у сваім дзённіку 27 лістапада 1939 г. Максім Танк, які на той час працаваў літработнікам абласной газеты «Вілейская праўда»: «Як хутка Вілейка мяняе свой выгляд! Быццам хтосьці разбудзіў гэты горад. Вілейка будуецца, як не будавалася за ўсю сваю гісторыю. Нехта павінен запісваць сённяшні дзень Вілейкі, найбольш слаўныя даты яго сучаснага і мінулага, імёны былых падпольшчыкаў, рэвалюцыянераў.
А то схамянемся і будзе позна...».

«Арганізаваць у Вілейцы краязнаўчы музей» – такі ліст даслалі ў рэдакцыю абласной «Сялянскай газеты» ў маі 1941 г. настаўнікі з Вілейкі Б.Фельдман і Ф. Шыраеў. Яны пісалі:
«... За гады савецкай улады ў нашай краіне створаны сотні новых музеяў. Кожны абласны цэнтр мае свой музей, дзе сканцэнтраваны матэрыялы, якія адлюстроўваюць гістарычнае мінулае вобласці і развіццё сацыялістычнага будаўніцтва.
У музеі захоўваюцца гістарычныя дакументы, якія паказваюць цяжкае мінулае народа, яго барацьбу за свабоду, і дакументы, адлюстроўваючыя шчаслівае і радаснае жыццё свабоднага народа пры савецкай уладзе. Няма музея толькі ў нас, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

г. Вілейка. А ён вельмі патрэбен. У музеі мы зможам убачыць у табліцах і дыяграмах рост асветы, развіццё навукі і мастацтва, прамысловасці і сельскай гаспадаркі ў нашай краіне і, у прыватнасці, у вобласці. У музеі мы маем магчымасць азнаёміцца з працэсам развіцця чалавечага грамадства. У ім павінны быць сабраны прадметы і дакументы, якія будуць служыць справе антырэлігійнай прапаганды. І, нарэшце, а гэта самае галоўнае, – у музеі павінны быць шырока і як мага паўней прадстаўлены прыродныя багацці вобласці, што акажа вялікую дапамогу ў справе асваення гэтых багаццяў і эканамічнага развіцця вобласці. У Вілейскай вобласці мы зможам знайсці вялікую колькасць гістарычных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў розных установах і на руках у прыватных грамадзян...

У 1940 г. па бюджэту Вілейскага гарвыканкама на стварэнне абласнога музея было адпушчана 55 тысяч рублёў, але гэтыя грошы не былі выкарыстаны. А гэта вялікае ўпушчэнне. Абласны цэнтр павінен мець свой краязнаўчы музей».

Але раптоўна грымнула вайна, а ў верасні 1944 г. абласным цэнтрам стаў г. Маладзечна, і толькі праз сорак гадоў задума была здзейснена.

30 ліпеня 1982 г. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі прыняў пастанову аб стварэнні Вілейскага гісторыка-краязнаўчага музея, які размясціўся ў будынку былой пажарнай аховы і з’яўляецца помнікам грамадзянскай архітэктуры пачатку XX ст. 7 мая 1985 г. была адкрыта першая экспазіцыя, якая размясцілася ў адной зале плошчай 179 кв. м. Тэматычная структура музейнай экспазіцыі такая ж, як і ўсіх краязнаўчых музеяў – «усебакова ў храналагічным парадку паказаць гісторыю раёна ад дарэвалюцыйнага мінулага да савецкага перыяду».

Пачатак 1990-х гг. адкрыў новы этап у музейнай справе Беларусі. Перамены ў палітычнай і эканамічнай сферах, распад СССР карэнным чынам змянілі абставіны жыцця музеяў.

Пачалася стваральная работа над новай экспазіцыяй. Раздзел па гісторыі савецкага грамадства замянілі на «Апрацоўка лёну і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Вілейшчыны». Гэта навяло на думку, што экспазіцыю можна будаваць не толькі храналагічна, але і тэматычна – пэўна і дакладна праз калекцыі экспанатаў раскрываць вызначаную тэму.

З 1993 г. працуе новая экспазіцыя, у аснове яе – тэматыка-калекцыйны метад паказу і аповеду. Экспазіцыя ўключае такія раздзелы, як «Час», «Вытокі», «Вілія», «Дом», «Дзяржава»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Пакуты», «Вілейка», якія адлюстроўваюць гісторыю і культуру Вілейскага краю ад першабытных часоў да XX ст. На 2012 г. асноўны фонд музея складае больш за 21 тысячу прадметаў, што дазваляе, улічваючы невялікую экспазіцыйную плошчу, перыядычна праводзіць невялікія рээкспазіцыі – мяняць тэмы, калекцыі і тым самым больш шырока прадстаўляць сваім наведвальнікам экспанаты. Напрыклад, напярэдадні падрыхтоўкі да міжнароднай беларуска-літоўскай экспедыцыі «Шляхам графа Тышкевіча праз паўтара стагоддзя» ў 2007 г. з’явіўся новы раздзел экспазіцыі з умоўнай назвай «Вялля – крыніца жыцця» (аб ролі ракі Вілія ў гісторыі Вілейшчыны і жыцці яе жыхароў праз матэрыялы першай навуковай экспедыцыі Канстанціна Тышкевіча па Віліі ў 1857 г. і экспедыцыі ў 2007 г.).

Навукова-гістарычны ўзровень і дасканаласць экспазіцыі найперш залежаць ад навуковых супрацоўнікаў музея, іх ведаў і прафесійнасці: тут кожны павінен вывучаць, ведаць і храналагічна, і тэматычна гісторыю свайго краю. Затым – ад мастака, ад яго Богам дадзенага і набытага ўласнай працай таленту і майстэрства. Гэта тыя два «кіты», без якіх экспазіцыя не можа быць створана на прыстойным прафесійным узроўні. Нашаму музею, можна сказаць, пашанцавала і на навуковых супрацоўнікаў, і на мастака – Анатоль Іванавіч Капцюг, мастак, архітэктар, член Саюза архітэктараў Беларусі. Дзякуючы сумесным намаганням, новыя экспазіцыі маюць адметны воблік і з цікавасцю праглядваюцца наведвальнікамі.

Дзейнасць музея нельга ўявіць без арганізацыі і правядзення выстаў, якія значна павышаюць асветніцкую, прапагандысцкую ролю музеяў, рэзка павялічваюць колькасць наведвальнікаў. Да 1997 г. уся выставачная дзейнасць музея была сканцэнтравана ў адной экспазіцыйнай зале.

18 мая – 15 гадоў таму, якраз у Міжнародны дзень музеяў, у асобным будынку персанальнай выставай знакамітага вілейскага мастака Эдуарда Мацюшонка адкрывалася выставачная зала музея паводле пастановы Вілейскага райвыканкама. Зала выстаў носіць імя Нікадзіма Сілівановіча (1834–1919), мастака, акадэміка жывапісу Расійскай імператарскай акадэміі мастацтваў, ураджэнца Вілейшчыны. Яго мазаікі ўпрыгожваюць галоўныя храмы Санкт-Пецярбурга – Ісакіеўскі сабор і Спас-на-крыві. Тут можна пабачыць дакладна выкананую мастаком Эдуардам Мацюшонкам копію

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

карціны Н. Сілівановіча «Салдат з хлопчыкам» (1866), адзіны твор, які захоўваецца і знаходзіцца ў пастаяннай экспазіцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі ў Мінску. У чэрвені 2012 г. адбыўся другі раённы пленэр, прысвечаны памяці Нікадзіма Сілівановіча.

Пачынаючы з першай выстаўкі, у музея склаліся трывалыя сувязі з многімі музеямі, мастакамі, калектывамі, народнымі ўмельцамі. Амаль кожны месяц прапаноўваюцца вілейчанам новыя выставы, цікавыя праекты і запрашаюцца да супрацоўніцтва ўсе, каму ёсць што паказаць і расказаць. А яшчэ гэта добрая магчымасць папоўніць фонды музея, бо пасля правядзення некаторых выстаў музей атрымлівае ў дар унікальныя рэчы. У свой час цёплыя сяброўскія адносіны склаліся ў супрацоўнікаў музея з народным мастаком СССР Андрэем Канстанцінавічам Сакаловым, які ў канцы 70-х гг. на беразе Вілейскага вадасховішча ў в. Сосенка пабудаваў дачу, што стала для яго майстэрняй. Менавіта тут нараджаліся яго лепшыя творы. Адбыліся тры персанальныя выставы мастака. Адну са сваіх карцін «Над Аралам», якая пабывала ў космасе, мастак падарыў музею.

Цікавыя словы ў кнізе водгукаў пакінуў Эдуард Мацюшонак: «Век машин и металла. Спешат все и везде. Самое страшное, что в этой суматохе начинаем терять самые чистые человеческие чувства, терять свои корни, свою память. И вот, как приятно войти в этот маленький мирок – экспозицию музея – и хоть на какой-то миг почувствовать себя обязанным людям, давшим нам основы красоты, основы истории нашего района. Я очень благодарен сотрудникам музея за то, что они прилагают все силы, оживляя нашу память. От экспозиции веет теплом, теплом наших далеких и близких предков, теплом, на котором держится все на этой земле».

1. *Каханоўскі, Г. А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў ХУІ – ХІХ стст. / Г. А. Каханоўскі ; навук. рэд. Л. Д. Побаль. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 120 с.

2. *Музеі* Беларусі. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2008. – 560 с.

3. *Музееведение.* Музеи исторического профиля: учеб. пособие для вузов по спец. «история» / под. ред. К. Г. Левыкина, В. Хербста. – М. : Высш. шк., 1988. – 431 с.

4. *Tyszkiewicz, K.* Wilija i jej brzegi / K. Tyszkiewicz. – Drezno, 1871.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ